Дзяржаўная ўстанова адукацыі

“Даўгінаўская сярэдняя школа

імя У.І.Слабодчыкава ”

# Урок геаграфіі

у 6 класе (7 клас першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю)

**Тэма:** Возера. Вадасховішча

Настаўнік-дэфектолаг

Н.А. Цімашчук

**Геаграфія**

**Тэма: Возера. Вадасховішча**

**Мэта**: 1)сфарміраваць прадстаўленні аб азёрах і вадасховішчах,навучыць паказваць азёры і вадасховішчы на карце Беларусі;

2)развіваць увагу,кругазор,уменне рабіці вывады;

3)выхоўваць цікавасць да вывучаемага матэрыялу.

**Абсталяванне**: падручнік,сшытак,картка з заданнямі для самастойнай работы.

**Ход урока**

**I.Арганізацыйны момант**

-Устанем. Добры дзень.Сядай.Настройся і расслабся.Урок пачнём мы, як заўсёды з пытання: ты гатова да ўрока?

- Так,гатова.

-Маладзец .Пачынаем працаваць.

**II.Актуалізацыя ведаў.**

Праверка дамашняга задання.

Самастойная работа: падкрэсліць назвы буйнейшых рэк Беларусі.

Дняпро, Сярчыстая, Прыпяць, Зуйка, Заходняя Дзвіна, Вілія, Нёман, Бярэзіна

**Самаправерка з дапамогай карткі**

(Дняпро, Нёман, Бярэзіна, Заходняя Дзвіна, Прыпяць

-Сярод назваў рэк, якія былі на картачцы была і наша маленькая рэчка. Якая? (Сярчыстая)

Маладзец.

**III.Асноўная частка.**

Адгадай загадку

***Калі сушу паглыбіць
І вадой яе заліць,
То атрымаецца яно
Пад названнем …(возера)

Сёння мы пагаворым пра азёры і вадасховішчы Беларусі.

Работа з падручнікам.

Адкрыць старонку 84.Веды пра азёры і вадасховішчы Беларусі ты будзеш здабываць сама,а я табе дапамагу.Сёння мы ўпершыню с табой

будзем не  проста запісваць розныя паняцці у сшытак,а навучымся складаць **план-канспект.**

Працаваць будзем у пары. Я буду задаваць пытанні,а ты шукаць адказ у падручніку і запісваць адказ у сшытак.

Перш ,чым пачаць працаваць пагуляем у гульню.Яна дапаможа сканцэнтраваць тваю слыхавую ўвагу.

Гульня “Што лішняе”.

Настаўнік называе словы-агародніну.Калі сярод агародніны чуецца слова,якое не адносіцца да гэтай групы-хлопнуць у далоні.

**Вывучэнне новага матэрыялу**.

Настаўнік чытае і задае пытанне.Вучаніца шукае адказ у падручніку.

*Што называецца возерам?

*Дзе можа ўтварацца возера на раўніне?Як яно называецца?

*З возера можа выцякаць рака.Як яно называецца?

*Як называюць возера,якое не дае пачатак рацэ?

**Хвілінка адпачынку.**

А зараз рубрыка “Цікава ведаць”(паведамленне настаўніка ст.85,паказ на карце)

Прадаўжаем працаваць.

*Самыя вялікія азёры Беларусі гэта….(паказ на карце)

-Як называюць Віцебскі край?

**Фізхвілінка.**

Каб твае ногі ,спіна не стаміліся ад сядзення за партай, давай паскачам.

Успомнім з урока біялогіі,як трэба хадзіць па балоце(перамяшчаемся з купіны на купіну).На кожнай купіне -назва возера .Я называю возера ,ты шукаеш назву і пераходзіш да яе.

*Самыя вялікія штучныя вадасховішчы гэта…(паказ на карце)

Папераджальнае заданне.**Рубрыка “Цікава ведаць”**

Вучаніца падрыхтавала невялікае паведамленне.

**VI Вынік.**

Падыйдзі да дошкі і яшчэ раз пакажы на карце,азёры,вадасховішчы Беларусі.

Што новага і цікавага ты даведалася сёння на ўроку?

**V.Рэфлексія**

Перад табою гара.Пастаў флажок там, дзе ты лічаш знаходзяцца твае веды па сённяшняй тэме.

Дамашняе заданне:З дапамогай плана –канспекта адказаць на пытанні на ст. 86.

Картка для самастойнай работы

Падкрэсліць назвы буйнейшых рэк Беларусі.

Дняпро, Сярчыстая, Прыпяць, Зуйка, Заходняя Дзвіна, Вілія, Нёман, Бярэзіна